***Тэма: Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Бяззлучнікавыя складаныя сказы”***

**Мэта**: падагульніць і сістэматызаваць веды пра бяззлучнікавы складаны сказ, праверыць веданне правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах і ўменне іх ставіць, замацаваць уменні вызначаць бяззлучнікавыя сказы ў кантэксце, складаць іх схемы;

стварыць умовы для развіцця ўмення звязна і лагічна выказваць свае думкі, уменняў і навыкаў самастойнай і калектыўнай працы, навыкаў кантролю і самаацэнкі, садзейнічаць развіццю памяці, увагі, лагічнага мыслення;

садзейнічаць выхаванню пачуцця адказнасці за вынікі сваёй працы, станоўчых адносін да набыцця ведаў, пачуцця гонару да роднага слова.

**Абсталяванне**: карткі з заданнямі, тэставае заданне, прэзентацыя

**Эпіграф:**

***Веды, якія не папаўняюцца штодзённа, памяншаюцца з кожным днём.***

Ход урока:

1. **Арганізацыйны пачатак урока**

   Псіхолага-педагагічная падрыхтоўка да ўрока

   *Настаўнік*: Я заўважаю парадак на рабочых месцах, а па вашых вачах магу зрабіць вывад: вы ўсе падрыхтаваліся, рады нашай сустрэчы, і настрой у вас добры. Шчыра ўсміхніцеся адзін аднаму, добраму надвор’ю… Няхай ад усмешкі зробіцца цяплей на душы, хай яна дапаможа лёгка і радасна працаваць сёння на ўроку.

2. **Паведамленне тэмы ўрока, мэтавызначэнне**

1. Сёння мы праводзім урок замацавання ведаў па тэме "Складаныя бяззлучнікавыя сказы".

   Давайце звернемся да эпіграфа сённяшняга ўрока.

   Які вывад мы зробім, прачытаўшы гэтыя радкі? (веды пастаянна трэба папаўняць, паўтараць). У канцы ўрока вы яшчэ раз звернецеся да эпіграфа і адзначыце яго надзённасць.

   І як бы працягам эпіграфа і пачаткам нашай практычнай часткі ўрока з'яўляецца наступны сказ.

   ***Хочаш быць адукаваным чалавекам … імкніся да ведаў.*** *[умова]* - *[ ]*.

   У канцы урока трэба будзе запісаць гэты сказ, на месцы пропуску паставіць знак прыпынку і зрабіць сінтаксічны разбор і даць характарыстыку сказа.

3. **Работа над паўтарэннем і сістэматызацыяй вывучанага**
   Давайце праверым вашы веды на практыцы.
   1) Наступны этап нашага ўрока – лічбавы дыктант. Я буду чытаць сказ, а вы, калі згодны са сцвярджэннем ,ставіце лічбу – 1, калі не згодны – лічбу- 0.

**1) Лічбавы дыктант**

1. Бяззлучнікавы складаны сказ – гэта сказ, у якім граматычныя часткі звязваюцца сэнсава і інтанацыйна.
2. Паміж featureрознатыпнымі часткамі БСС могуць выражацца прычынныя, умоўныя, дапаўняльныя сэнсавыя адносіны.
3. У БСС галоўным сродкам сувязі частак з’яўляецца злучнік.
4. У БСС паміж часткамі могуць ставіцца коска, кропка з коскай, працяжнік, двукроп’е.
5. Коска ставіцца паміж часткамі БСС, калі яны маюць ускладненую будову і свае знакі прыпынку.
6. Працяжнік ставіцца, калі другая частка раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай частцы. Паміж такімі часткамі можна ўставіць словы *бо, таму што.*
7. Гэта бяззлучнікавы складаны сказ:

*У кастры патрэсквалі дровы , і шызы дымок падымаўся ў неба, расставаў.*

**Адказ:1101000**

***<u>(самаправерка – адказ – на экране)</u>***

**2) Схемы**

Пераходзім да наступнага этапа ўрока, дзе вы будзеце працаваць у мікрагрупах. На картцы дадзены схемы складаных бяззлучнікавых сказаў і сказы, з якіх трэба выбраць тыя, якія адпавядаюць гэтым схемам:

1) [ ], [ ].
2) [ ]: [прычына].
3) [умова, час] - [ ].

*1. То не струны звіняць галасістыя зашумела жытцо каласістае.*
*2. На паплавах ходзіць цыбаты бусел недзе ў затоках сонна крэкчуць жабы.*
*3. Есць раніца павінен быць і вечар.*
*4. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому кліча яго рэчка цягнуць санкі з дому.*
*5. Луг адазваўся грому працяжна лес адгукнуўся стары.*
*6. Запяеш па душы дасі ўцехі гасцям поўны гуслі насыплю дукатаў.*
*7. Клікнуць хацелася голас замёр.*
*8. Заглянуць у вокны ніхто не мог шыбы пакрыліся тоўстым пластом намаразі.*
*9. Вецер загуляе хвойнік лозы гнуцца*

**Картка-ключ**
**[                ], [              ]. (2,5)**
**[                ]: [прычына]. (4,8)**
**[умова, час] - [            ]. (3,6,9)**

**3)Работа ў групах**

**Выпісаць бяззлучнікавыя складаныя сказы, расставіць знакі прыпынку, скласці схемы**

Над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары прысадзісты тоўсты дуб. Доўгі час бераг знаходзіўся пад вадою, паволі асоўваўся і агаляў тоўстыя карані старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся набок працягнуты пад вадою  яго корань здаваўся нагою. Выходзіла так дуб збіраўся перабрысці Нёман. Сеўшы на гэтым корані, Базыль бачыў бегалі дробныя хвалі звівалася ў вадзе доўгая раска. Вада то ўздымала  яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам.

**4)Шыфроўка**

Прачытайце сказ, упішыце ў клетку знак прыпынку, які неабходна паставіць у бяззлучнікавым сказе

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

1. Адчыніш фортку – павее халадок.
2. Дзесьці вухкаў пугач, яго крык гулка разносіўся па лесе.
3. Цяпер я зразумеў: дарога гэтая не такая ўжо простая.
4. Адбяруць у чалавека любімую працу – пустым стане яго жыццё.
5. Вечарам загараліся вогнішчы, засыпаючы іскрамі зорнае неба; у кацялках булькаў чай.
6. Ветрык развеяў туман, перастала імжыць.
7. Гультаю ўсё некалі: раніцай росна, удзень млосна, увечары камары кусаюць.
8. Дні стаялі ўвесь час пагодныя, духмяныя; неба сінела высокае, бяздоннае і чыстае.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| - | , | : | - | ; | , | : | ; |

**5) Фізкультхвілінка**

Фізкультурна-лінгвістычная хвілінка

Зачытваецца бяззлучнікавы складаны сказ – устаць.

1. Бярыся дружна  – не будзе натужна.
2. Паміраць збіраешся, а жыта сей.

3. Загараецца зара, гасне ноч над зямлёю.
4. Назаўтра ледзь паказалася сонца, хлопцы былі ўжо на нагах.
5. Ніхто спрачацца з тым не будзе, што ўсюды шмат мясцін прыгожых.
6. Вакол стала глуха і цёмна.
7. Зіма снежная – лета будзе дажджлівае.

**6) Карэктар ( выправіць памылкі)**

Глянуў у акно – над вёскай стаяла цёмная хмара.
Сышоў снег ; зелянелі пагоркі ; прыляцелі птушкі.
Усе былі заняты справай : Саша капаў ямкі, Косця садзіў дрэўцы.
Адзін раз зманіш – другі раз не паверాць.
Косця вельмі перажываў, дрэўцы раслі слаба.
*(самаправерка)*
Глянуў у акно : над вёскай стаяла цёмная хмара.
Сышоў снег , зелянелі пагоркі , прыляцелі птушкі.
Усе былі заняты справай : Саша капаў ямкі, Косця садзіў дрэўцы.
Адзін раз зманіш – другі раз не павераць.
Косця вельмі перажываў: дрэўцы раслі слаба.

**Выніковы кантроль**

**7) Тэставае заданне**

1. **Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы**

А) Спявае лета над барамі, сасонкі струнамі звіняць, гамоніць поле каласамі , шапоча ў кветках сенажаць.
Б) Зябнуць вербы на марозе, і глуха лес гамоніць.
В) Першы марозік моцна скаваў зямлю, у паветры кружацца рэдкія сняжынкі.
Г) Я люблю бярозку, што пяе з вятрамі.

2. **Адзначце БСС, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку**

А) Можна было ісці дадому: рабочы дзень скончыўся.
Б) Дождж мочыць; сонца сушыць.
В) Андрэй зірнуў на неба – чорная хмара вісела амаль над ім.
Г) Любіце працу: у ёй найбольшы смак жыцця.

**3. Адзначце БСС з аднатыпнымі часткамі**

А) Хмурна было, суха, дзьмуў вецер.
Б) Адчыніш фортку – павее халадок.
В) Праз вокны відаць: на ўсходзе разгараецца раніца.
Г) У полі дзьмуў калючы вецер, пачыналася завея.

**4. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік**

А) Азірніся і ўбачыш __ ля цябе я ў любую хвіліну.
Б) Кінеш спераду__ знойдзеш ззаду.
В) Няма лесу___ няма жыцця.
Г) Вакол спакойна дрэмле поле ___ блішчыць у росах сенажаць.

**5. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца двукроп'е**
А) Спадала лета __ ішоў ранні верасень.
Б) Усё навокал было па-ранейшаму __ глуха шумеў лес, над зямлёй плылі хмары.
В) Мне здалося __ па бруку ідзе маладая сасонка.

*( правярае настаўнік)*
**4.Падагульненне. Рэфлексія**
А зараз зробім вывад з нашага ўрока, апісаўшы яго ў форме рэпартажу па пачатку сказаў.Вазьміце картку і дапішыце сказы, выкарыстаўшы аналіз працы на сённяшнім ўроку. Працуем у мікрагрупах.
**Апісаць урок мовы ў форме рэпартажу па пачатку сказаў.**
4 сакавіка мы прысутнічаем на ўроку беларускай мовы ў 9 " Г" класе у горадзе Брэсце. Ідзе даследванне тэмы "Складаныя бяззлучнікавыя сказы".
*Урок пачаўся -*________________________
*Настаўнікам перад класам ставіцца задача:*______________
*За працу ўзяліся дружна:*_____________________
*Кожны з нас добра ведае -*___________________
*Адказы вучняў сведчаць -*____________________
*Урок быў цікавы:*___________________________
*Для сябе я зрабіў вывад -*________________________________________

- Да якога стылю мы аднясём атрыманы тэкст? (да публіцыстычнага, бо гэта рэпартаж);
- Якую ролю выконваюць у гэтым тэксце складаныя бяззлучнікавыя сказы ? (надаюць тэксту лаканічнасць, выразнаць, эмацыянальнасць, дынамізм)

Звернемся да сказа, які запісаны на дошцы
***Хочаш быць адукаваным чалавекам … імкніся да ведаў.*** *[умова] - [ ].*
(Сказ складаны бяззлучнікавы, складаецца з дзвюх частак, якія звязваюцца беззлучнікавай сувяззю, сродак сувязі-інтанацыя, паміж часткамі сказа ставіцца працяжнік, таму што першая частка паказвае на ўмову).
Звернемся зноў да эпіграфа ўрока і возьмем яго за дэвіз у нашай вучобе.

**5.Дамашняе заданне**
**6.Каменціраванае выстаўленне адзнак за ўрок**.

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы

**2) Схемы**

На картцы дадзены схемы складаных бяззлучнікавых сказаў і сказы, з якіх трэба выбраць тыя, якія адпавядаюць гэтым схемам:

1) [ ], [ ].
2) [ ]: [прычына].
3) [умова, час] - [ ].

*1. То не струны звіняць галасістыя зашумела жытцо каласістае.*
*2. На паплавах ходзіць цыбаты бусел недзе ў затоках сонна крэкчуць жабы.*
*3. Есць раніца павінен быць і вечар.*
*4. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому кліча яго рэчка цягнуць санкі з дому.*
*5. Луг адазваўся грому працяжна лес адгукнуўся стары.*
*6. Запяеш па душы дасі ўцехі гасцям поўны гуслі насыплю дукатаў.*
*7. Клікнуць хацелася голас замёр.*
*8. Заглянуць у вокны ніхто не мог шыбы пакрыліся тоўстым пластом намаразі.*
*9. Вецер загуляе хвойнік лозы гнуцца*

**3) Работа ў групах**

**Выпісаць бяззлучнікавыя складаныя сказы, расставіць знакі прыпынку, скласці схемы**

Над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары прысадзісты тоўсты дуб. Доўгі час бераг знаходзіўся пад вадою, паволі асоўваўся і агаляў тоўстыя карані старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся набок працягнуты пад вадою яго корань здаваўся нагою. Выходзіла так дуб збіраўся перабрысці Нёман. Сеўшы на гэтым корані, Базыль бачыў бегалі дробныя хвалі звівалася ў вадзе доўгая раска. Вада то ўздымала яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам.

**4)Шыфроўка**

Прачытайце сказ, упішыце ў клетку знак прыпынку, які неабходна паставіць у бяззлучнікавым сказе

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

1. Адчыніш фортку _павее халадок.
2. Дзесьці вухкаў пугач_яго крык гулка разносіўся па лесе.
3. Цяпер я зразумеў_дарога гэтая не такая ўжо простая.
4. Адбяруць у чалавека любімую працу _ пустым стане яго жыццё.
5. Вечарам загараліся вогнішчы, засыпаючы іскрамі зорнае неба_ у кацялках булькаў чай.

6. Ветрык развеяў туман_перастала імжыць.
7. Гультаю ўсё некалі_ раніцай росна, удзень млосна, увечары камары кусаюць.
8. Дні стаялі ўвесь час пагодныя, духмяныя_неба сінела высокае, бяздоннае і чыстае.

**6) Карэктар ( выправіць памылкі)**

Глянуў у акно – над вёскай стаяла цёмная хмара.

Сышоў снег ; зелянелі пагоркі ; прыляцелі птушкі.

Усе былі заняты справай : Саша капаў ямкі, Косця садзіў дрэўцы.

Адзін раз зманіш – другі раз не павераць.

Косця вельмі пераживаў, дрэўцы раслі слаба.

**Апісаць урок мовы ў форме рэпартажу па пачатку сказаў.**

4 сакавіка мы прысутнічаем на ўроку беларускай мовы ў 9 “ Г” класе у горадзе Брэсце. Ідзе даследванне тэмы "Складаныя бяззлучнікавыя сказы".

*Урок пачаўся -*________________________

*Настаўнікам перад класам ставіцца задача:*______________

*За працу ўзяліся дружна:*_____________________

*Кожны з нас добра ведае -*___________________

*Адказы вучняў сведчаць -*___________________

*Урок быў цікавы:*__________________________

*Для сябе я зрабіў вывад -*_______________________________________